## ТАВАРЫШ КАЗЛОЎ У НЬЮ-ЙОРКУ

Нью-Йорк не знаў такіх падзей.
Тузы глядзяць з пагардай:
ідуць натоўпы цэлы дзень
у Мэдзісан Сквер-Гардэн.

Паліцыя ўся на нагах.
Трашчыць палац вялікі —
сарвуць, здаецца, шызы дах
і воплескі, і крыкі.

Тут мітынг, як на моры шторм.
Ды зала не ўмяшчала
усіх з заводаў і кантор
і з чорнага квартала.

І тысячы стаяць сцяной
ля вокан, ля ўваходу,
Савецкі чалавек з сабой
сюды прывёз свабоду.

Глядзіць ён шчыра на сяброў,
і пад яго аховай
сягоння чорны сын рабоў
бярэ ад Поўдня словы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы